Rzeczpospolita Polska
Ministerstwo
Spraw Zagranicznych

Gdańska Fundacja Oświatowa

International School of Gdansk

| Сцэнар урока/ прапанова праекту * | |
|---|---|
| | |
| **Краіна партнэр** | Польшча |
| **Тэма ўрока** | Звычайны дзень з Агульнай Дэклярацыяй Правоў Чалавека |
| **Рэкамэндаваная вялічыня групы** | 20-30 асобаў |
| **Рэкамэндаваны ўзрост удзельнікаў** | Ад 12 год |
| **Рэкамэндаваны час** | 90 хв. |
| **Мэты** | • Азнаямленьне з Агульнай эклярацыяй Правоў Чалавека.<br>• Азнаямленьне з падставовымі правамі чалавека.<br>• Знаёмства з паняцьцем дыскрымінацыя.<br>• Знаёмства з арганізацыямі, што працуюць на карысьць правоў чалавека.<br>• Усьведамленьне вучням, што правы чалавека датычаць кожнага.<br>• Разьвіцьцё крэатыўнасьці і ўменьня выражаць сябе.<br>• Аўтарэфлексія. |
| **Мэта ўроку** | Пасьля ўроку вучань павінен:<br>• Умець распавесьці гісторыю паўставаньня Агульнай Дэкларацыі Правоў Чалавека і ўмець яе схарактэрызаваць.<br>• Пералічыць асноўныя правы чалавека.<br>• Разумець і тлумачыць на чым палягае дыскрымінацыя.<br>• Пералічыць арганізацыі, каторыя змагаюцца з ламаньнем правоў чалавека.<br>• Быць сьвядомым сваёй пазыцыі і грамадзкай пазыцыі ў дачыненьні да асноўных правоў чалавека. |
| **Матэрыялы** | • Вырукі Агульнай эклярацыі Правоў Чалавека.<br>• Пакроеныя сказы з Дэклярацыі.<br>• Блок для маляваньня альбо папреа з рэсайклінгу (нп. Старыя выдрукі ці плякаты)<br>• Газэты<br>• Клей<br>• Нажніцы<br>• Папера А4<br>• Асадкі<br>• Выдрук кола з упісаным у яго меншым колам, падзеленым на 16 частак. У кожную частку ўпісанае адно з асноўных правоў чалавека, гарантаваных Агульнай Дэклярацыяй: 1. права на жыцьцё, 2. асабістая свабода, 3. забарона катаваньня, 4.асабістая недатыкальнасьць, 5. права на суд, 6. свабода сумленьня і веравызнаньня, 7. свабода слова, 8. права на ўласнасьць, 9. свабода сходаў і абьяднаньняў, 10. свабода перамяшчэньня, 11. права на працу, 12. права на ахову здароў'я, , 13.права на адукацыю. 3 вольныя фрагмэнты. |

80-842 Gdańsk, ul. Osiek 11/12, tel./fax (58) 305-80-60, 305-80-61, www.gfo.pl gfo@gfo.pl

*Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.*

**Уводзіны:**
Прэзэнтуйце вучням тэму ўрока. Распавядзіце, што падчас занятка яны будуць мець нагоду пазнаёміцца з Агульнай Дэклярацыяй Правоў Чалавека і паспрабуюць зразумець якое яе значэньне ў грамадстве.

**Заданьні настаўніка:**

1. Патлумачце вучням, што яны ў парах будуць выконваць розныя заданьні.

- Папрасіце іх аб тым, каб падняцца з месцаў і шпацыраваць па залі.
- Потым папрасіце, каб выбралі сабе пару і ў тых парах адказалі сабе на заданае настаўнікам пытаньне. 1,5 хвіліны адказвае адна асоба ў пары, а наступныя 1,5 хвіліны іншыя.
- Потым папрасіце вучняў разыйсьціся і працягваць шпацыр. На наступны Ваш знак вучні зноў абіраюць сабе пару, але ўжо з іншымі асобамі і зноў адказваюць на пытаньні..
- Пры кожным наступным пытаньні працуюць у іншых парах.
- Пытаньні:
  a) Што апошнім разам дапмагло вам ганарыцца сабою?
  b) Што апошнім разам дапамагло вам пачувацца вольным/ай?
  c) Уявіце сабе, што Вы трапілі з групай асобаў на бязьлюдную выспу. Усталюйце супольныя правы, якія б Вы хацелі, каб існавалі ў Вашым грамадзтве. Вы можаце прапанаваць толькі 3 права. Што гэта будуць за яны?
  d) Уявіце сабе, што Вы трапілі з групай асобаў на бязьлюдную выспу.Усталюйце супольныя умовы жыцьця на высьпе. Якія б 3 абавязкі Вы ўзялі б на сябе??
- Па сканчэньнб папрасіце аб вяртаньні на месцы.

2. Скажыце вучням, што ў наступнай частцы занятка ўдзельнікі з 3-асабовых групах створаць калажы, каторыя маюць прадставіць асобныя правы чалавека з Агульнай Дэклярацыі, а потым распавядуць аб іх на форум.

- Падзяліце групу на 3-асабовыя падгрупы..
- Кожная группа павінна выцягнуць адзін фрагмэнт з агульнайДэклярацыі.
- Разкладзіце матэрыялы, падрыхтаваныя для стварэньня каляжа побач (блок, газэты, клей, нажніцы).

- Па сканчэньні працы вучні вешаюць свае каляжы разам з выцягнутым правам.
- Рэшту правоў прыклейваем паміж каляжамі.

**Заданьні вучня**
**Хуткія сустрэчы (15 хв)**

- Вучні шпацыруюць
- Па сыгнале шукаюць сабе пару і размаўляюць на акрэсьленую тэматыку, спачатку адна асоба ў групе, потым – другая.
- Праз 4 хвіліны пары разыходзяцца і вучні ізноў шпацыруюць.
- Пасьля чарговага сыгналу ад вяучага, выбіраюць наступную пару і адказваюць на наступныя пытаньні.
- Падобная сытуацыя адбываецца пры кожным пытаньні.
- Пасьля сканчэньня заданьня вучні вяртаюцца на свае месцы.

**Галерэя Правоў Чалавека (40 хв)**

- Вучні дзяляцца на 3-асабовыя групы.
- Кожная падгрупа выцягвае адно з правоўц, што месьцяцца ў Агульнай эклярацыі Правоў Чалавека.
- У групах вучні падрыхтоўваюць каляжы, каторыя прэзэнтуіць "іх" права.
- Выкананыя працы вучні вешаюць на сьцяне, ствараючы Галерэю Правоў Чалавека.

- Вучнёве наведваюць галерэю і знаёмяцца з Агульнай Дэклярацыяй Правоў Чалавека.
- Вучні распавядаюць аб сваіх працах.
- Вучні бяруць актыўны ўдзел у дыскусіі.
- Вучні актыўна слухаюць аб зьяўленьні Агульнай Дэклярацыі Правоў Чалавека.



*Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.*

<table>
<tr>
<td>

- Разам наведайце галерэю.
- Групы распавяюць аб сваёй працы.
- Спытайцеся, ці хтосьці хацеў бы зааць нейкае пыьаньне аўтарам каторагасьці з каляжоў альбо ў справе нейкага права.
- Задайце пытаньні, ці яны бачаць сувязі паміж правамі з Дэклярацыі і аказамі на пытаньні з першага заданьня.
- Каротка распавязіце аб зьяўленьні Агульнай Дэклярацыі Правоў Чалавека.

Перапынак

3. Патлумачце, што наступнае заданьне будзе індывідуальнай працай.

- Раздайце вучням карты ўпісанымі ў кола асноўнымі правамі з Дэклярацыі.
- Папрасіце, каб прыгадалі сабе, калі яны адчувалі, што іх пазбавілі нейкага права. Няхай напішуць гэта ў вонкавым коле. Калі адчуваюць, што былі пазбаўленыя нейкага права, каторае не запісана, то могуць дапісаць яго ў вольным полю.
- Папрасіце, каб вучні прыгаалі сабе, калі самі пазбавілі каго-небузь каторагасьці з гэтых правоў. Няхай запішуць гэтыя правы ва ўнутраным коле. Калі лічаць, што нарушылі чыёсьці права, каторае не напісана, то могуць дапісаць у вольным полі.
- Пасьля скончэньня заданьня спытайцеся на форум, ці было яно простым, ці склааным. Як яны адчувалі сябе пры запаўненьні вонкавага і ўнутранага кола, якімі эмоцыямі гэта суправажалася. Якія сытуацыі гэтаму спрылі, ці сапраўды гэта мела падставы ці можна было па іншаму вырашыць гэтую чытуацыю. Якім чынам?
- Спытайцеся, ці яны ведаюць, як называецца пазбаўленьне належных чалавеку правоў?
- Прадстаўце дэфініцыю дыскрымінацыі: Дыскрымінацыя азначае неўласьцівыя, выбарчыя, крыўдныя, безпадстаўныя і несправядлівыя падыходы да канкрэтных адзінак з нагоды іх групавой прыналежнасьці, нп. Этнічнай, рэлігійнай ці полавай.

**4.** Задайце пытаньне, якія вучні ведаюць арганізацыі, каторыя працуюць на карысьць правоў чалавека.

- Прадстаўце лякальныя і міжнародныя арганізацыі (нп. Amnesty International).

</td>
<td>

**Правы чалавека ў жыцьці (25 хв.)**

- Вучні атрымліваюць лісты з заданьнем.
- Каля 15 хвілі самастойна запаўняюць картку.
- Вучні бяруць актыўны ўдзел у дыскусіі.
- Вучні даведваюцца дэфініцыю дыскрымінацыі.

**Арганізацыі, каторыя працуюць на карысьць правоў чалавека. (10 хв.)**

Вучні прээнтуюць вядомыя ім арганізацыі, каторыя працуюць на карысьць правоў чалавека.

Вучні знаёмяцца з арганізацыямі, каторыя так працуюць, прээнтаванымі асобай, што правозіць занятки.

</td>
</tr>
<tr>
<td colspan="2">

**Падсумаваньне:**

Апроч існаваньня Агульнай Дэклярацыі Правоў Чалавека і Грамадзяніна мы самі ў жыцьці часта пазбаўленыя сваіх правоў і пазбаўляем гэтых правоў іншых. Сьвядомасьць гэтага зьяўляецца першым крокам да зьменаў. Кожны можа актыўна працаваць на карысьць правоў чалавека, а таксама розныя інстытуцыі і арганізацыіі актыўна становяцца ў іх абароне.

</td>
</tr>
</table>

| | |
|---|---|
| **Спасылкі на матэрыялы, каторыя павінныя быць выкарыстаныя падчас урока** | www.unesco.pl/fileadmin/user_upload/pdf/Powszechna_Deklaracja_Praw_Czlowieka.pdf |

**Рэкамэндаваная ацэнка занятка:**

Актыўны ўдзел ва ўроку
Здольнасьць працы ў групе
Здольнасьць выказвацца

Назіраньне настаўнікам/выхавацелем за клясай і яе спосабамі ўзаемакамунікаваньня і крытычнай канструктыўнай аўтарэфлексіі.

**Крыніцы, на каторыя абапіраецца ўрок**

www.unesco.pl/fileadmin/user_upload/pdf/Powszechna_Deklaracja_Praw_Czlowieka.pdf
www.rownosc.info/rownosc.php/main/show/attachment/31

*калі датычыцца іншых формаў заняткаў, то просім зьмяніць

Апрацаваньне:Эльжбэта Окроы, Эва Окроы

*Публікацыя выражае толькі погляды аўтара і ня можа быць трактаваная як афіцыйная пазыцыя Міністэрства Замежных Справаў РП.*